**І.М.Стрыжонак,** *дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў*

# ІНАВАЦЫЙНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ФАРМІРАВАННЯ КРАЯЗНАЎЧЫХ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ У РЭГІЁНАХ БЕЛАРУСІ

Краязнаўству сёння надаецца важнае значэнне; яно ўсё больш набывае выражаны сацыяльны характар, і яго змест знаходзіцца ў прамой залежнасці ад праблем, якія паўсталі перад грамадствам. Краязнаўчую дзейнасць у Беларусі ажыццяўляюць амаль усе бібліятэкі рэгіянальнага ўзроўню, але галоўным звяном бібліятэчнага краязнаўства з’яўляюцца публічныя бібліятэкі Міністэрства культуры, сярод якіх галоўнае месца займаюць універсальныя абласныя бібліятэкі, што ўтрымліваюць найбольш поўныя і каштоўныя краязнаўчыя дакументныя інфармацыйныя рэсурсы. Укараненне і асваенне камп’ютэрных тэхналогій, стварэнне ў перспектыве інфармацыйнай сеткі тэлекамунікацый для доступу да баз даных садзейнічаюць пераўтварэнню абласных бібліятэк у сучасныя інфармацыйна-бібліятэчныя цэнтры. Пэўныя змены назіраюцца ў фарміраванні краязнаўчых дакументных інфармацыйных рэсурсаў: павялічваецца разнастайнасць камплектуемых крыніц, у тым ліку набываюцца новыя віды дакументаў у электроннай форме; універсальныя абласныя бібліятэкі пачалі камплектаваць свае фонды паўнатэкставымі базамі даных на кампакт-дысках і інш. Змены ў сістэме дакументазабеспячэння бібліятэк, рост прадукцыі вялікай колькасці выдавецкіх арганізацый, абмежаванасць бібліятэчнага фінансавання – усё гэта прымушае абласныя бібліятэкі шукаць інавацыйныя падыходы да забеспячэння паўнаты сваіх фондаў і ўдасканалення фарміравання інфармацыйных рэсурсаў. Важныя якасці апошніх – паўната; дастатковасць інфармацыйных адзінак для стварэння новых даных на аснове існуючых; актуальнасць – адпаведнасць бягучаму моманту; аб’ектыўнасць як ступень павышэння верагоднасці інфармацыйных адзінак; адпаведнасць рэальным інфармацыйным патрэбнасцям; даступнасць – магчымасць без перашкод атрымаць інфармацыйную адзінку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз структуры краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў сведчыць аб наяўнасці працэсу скарачэння традыцыйнай кампаненты рэсурсаў і павелічэнні аб'ёму электроннай за кошт набыцця баз даных, генерыравання ўласных баз даных, алічбоўкі дакументаў, шырокага выкарыстання сеткавых рэсурсаў і г.д. Адным са шляхоў павелічэння электроннай часткі рэсурсаў з'яўляецца стварэнне бібліятэкамі электронных калекцый. Па гісторыі краю іх магчыма ажыццявіць на аснове дамоўленасці з аўтарамі аб перадачы ў бібліятэку электронных копій выданняў або публікацый для некамерцыйнага выкарыстання і размяшчэння ў Інтэрнеце. Гэта дазволіць забяспечыць доступ да мясцовых выданняў, рэдкіх краязнаўчых дакументаў і адначасова дазволіць іх захаваць. Так, Віцебская абласная бібліятэка вядзе паўнатэкставую базу даных "Віцебшчына. Дакументальная спадчына", якая ўтрымлівае калекцыю алічбаваных рэдкіх краязнаўчых выданняў аб Віцебшчыне XIX – пачатку XX ст. Вопыт універсальных абласных бібліятэк па размяшчэнні ў Інтэрнеце інфармацыі аб рэгіёне магчыма разглядаць як спробу інфармацыйнага мадэліравання культурнай прасторы рэгіёну. У будучым такая дзейнасць дазволіць стварыць інфармацыйна-пазнавальны краязнаўчы партал, мэта якога – прадастаўленне роўных магчымасцей у атрыманні доступу да краязнаўчых рэсурсаў для ўсяго насельніцтва рэгіёну і фарміраванне рэгіянальнага кампанента ў агульнарэспубліканскай інфармацыйнай прасторы.

Сёння аб'ём краязнаўчай інфармацыі і цікавасць да яе пастаянна ўзрастаюць. Карыстальнікам складана знайсці неабходныя крыніцы, хутка арыентавацца ў інфармацыйным патоку. Таму якаснае, аператыўнае задавальненне патрэбнасцей карыстальнікаў (у тым ліку аддаленых), забеспячэнне даступнасці краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў немагчымы без выкарыстання камп'ютэрных тэхналогій. На ўзроўні рэгіёну праблема вырашаецца двума шляхамі: набыццё гатовых інфармацыйных прадуктаў; стварэнне ўласных БД (Магілёўская абласная бібліятэка вядзе паўнатэкставую БД "Край мой, Магілёўшчына", усе абласныя бібліятэкі вядуць БД "Краязнаўчая літаратура").

Сёння універсальныя абласныя бібліятэкі маюць комплекс краязнаўчых БД. Напрыклад, у такі комплекс БД Віцебскай абласной бібліятэкі ўваходзяць электронны каталог "ALIS MEMORY", які ўключае інфармацыю БД "Краязнаўчая літаратура", паўнатэкставая бібліяграфічная БД "Прыдзвінскі край: гісторыя і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сучаснасць”, дзе прадстаўлены звесткі па гісторыі, эканоміцы і культурным жыцці раёнаў Віцебскай вобласці; БД “Каляндар знамянальных і памятных дат Віцебшчыны”; персанальныя базы даных: “П.М.Явіч – беларускі мастак”; паўнатэкставая БД “Віцебшчына: дакументальная спадчына” і інш. Комплекс краязнаўчых баз даных складае краязнаўчы інфармацыйна-пазнавальны партал, стварэнне якога – адзін з інавацыйных падыходаў да фарміравання краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў у рэгіёнах.

Інавацыйным падыходам можна лічыць і развіццё інтэграцыі бібліятэк рэгіёну ў адзіную бібліятэчна-інфармацыйную прастору незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці.

Набыццю цэласнасці і інтэгратыўных якасцей садзейнічаюць развіццё міжбібліятэчнага ўзаемадзеяння ў галіне фарміравання і выкарыстання ў тым ліку і краязнаўчых рэсурсаў, а таксама супрацоўніцтва органаў улады розных узроўняў, якія ажыццяўляюць кіраванне публічнымі бібліятэкамі.

Адной з асноўных формаў арганізацыі ўзаемадзеяння з’яўляецца карпаратыўнае аб’яднанне. Асвойваючы сеткавыя тэхналогіі, бібліятэкі ў рэгіёнах Беларусі прыходзяць да разумення неабходнасці сумеснай дзейнасці па стварэнні сеткавых рэсурсаў на аснове карпаратыўнага ўзаемадзеяння. Пры стварэнні рэгіянальных карпаратыўных бібліятэчных сістэм абласныя бібліятэкі як цэнтральныя бібліятэкі рэгіёнаў павінны падрыхтаваць сваіх традыцыйных партнёраў да новых тэхналогій узаемадзеяння і вызначыць ролю кожнага ў межах адзінай карпаратыўнай сеткі. Дзейнасць такіх карпарацый будуецца на прынцыпах раздзялення аб’ёму выконваемых работ. Дaступнасць краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў для аддаленага карыстальніка становіцца адным з крытэрыяў ацэнкі эфектыўнасці такой дзейнасці. Стварэнне і функцыянаванне карпаратыўных бібліятэчных сістэм у рэгіёнах дазволяць ажыццяўляць анлайнавы доступ карыстальнікаў да інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк – удзельніц карпаратыўнай бібліятэчнай сістэмы; электронныя заказы (электронны МБА) і дастаўку паўнатэкставых дакументаў (электронная дастаўка дакументаў); інтэграцыю інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк – удзельніц карпарацыі – у сістэму рэгіянальных, нацыянальных і сусветных інфармацыйных рэсурсаў. З 2006 г. усе шэсць абласных бібліятэк Беларусі ўваходзяць у карпаратыўную камп’ютэрную бібліятэчную сетку ў межах дзяржаўнай праграмы “Электронная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусь”. Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна з 2007 г. з’яўляецца ўдзельнікам кансорцыума па аналітычным апісанні дакументаў з выкарыстаннем праграмнага пакета ALIS (ALIS – ВНУ).

Інавацыйным падыходам да фарміравання краязнаўчых дакументных інфармацыйных рэсурсаў можна лічыць і стварэнне размеркаванага фонду бібліятэкамі рэгіёну на аснове міжбібліятэчнага ўзаемадзеяння і падзелу адказнасці і функцый. Абласныя бібліятэкі павінны выступаць каардынатарамі ў стварэнні размеркаваных фондаў намаганнямі шэрага бібліятэк рэгіёну. Пры гэтым кожная бібліятэка-ўдзельніца адказвае за фарміраванне сваёй часткі рэгіянальнага размеркаванага фонду, забяспечвае стварэнне калекцыі каштоўных краязнаўчых і мясцовых дакументаў па ўсяму колу тэм, тыпаў, відаў дакументаў сваёй спецыялізацыі або галіны. Абласным бібліятэкам неабходна прыкладаць пэўныя намаганні па стварэнні аптымальных умоў, якія б садзейнічалі фарміраванню размеркаваных краязнаўчых дакументных інфармацыйных рэсурсаў. Гэта найперш разумная і дакладная спецыялізацыя (прафіліраванне) у фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў; забеспячэнне надзейнасці і беспе-рапыннасці паступлення краязнаўчых дакументаў у размеркаваны фонд; стварэнне сістэмы аператыўнага пераразмеркавання няпрофільных, дублетных і малавыкарыстоўваемых дакументаў; аптымізацыя сістэмы інфармацыі аб краязнаўчых рэгіянальных інфармацыйных рэсурсах. Як каардынацыйным цэнтрам абласным бібліятэкам неабходна выкарыстоўваць перш за ўсё арганізацыйныя метады развіцця ўзаемадзеяння бібліятэк: узгадненне планаў фарміравання краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў; заключэнне адпаведных дагавораў і пагадненняў; абмен матэрыяламі і дакументамі; перыядычныя кантакты па падрыхтоўцы шэрага неабходных матэрыялаў; стварэнне рабочых груп для распрацоўкі і правядзення сумесных нарад. Наступны этап – фарміраванне зводнага тэматыка-тыпалагічнага профілю камплектавання бібліятэк рэгіёну, які адначасова выконвае мадэлі-руючую і прагнастычную функцыі ў развіцці карпаратыўнай каталагізацыі.

Цікавым інавацыйным падыходам можна лічыць развіццё ўзаемадзеяння бібліятэк прыгранічных тэрыторый. Назапашаны пэўны вопыт супрацоўніцтва бібліятэк Гомельскай, Магілёўскай абласцей з бібліятэкамі Бранскай вобласці Расіі і Чарнігаўскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобласці Украіны. Так, фарміраванню краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў садзейнічае той факт, што ў выніку дамоўленасці паміж Гомельскай абласной бібліятэкай, Бранскай абласной навуковай універсальнай бібліятэкай і Чарнігаўскай абласной універсальнай навуковай бібліятэкай з 2002 г. вядзецца электронная БД "Живая вода дружбы" – паўнатэкставы інфармацыйны рэсурс, які дазваляе прааналізаваць інфармацыйны фонд па праблемах прыгранічнага супрацоўніцтва трох суседніх абласцей, прасачыць яго інтэнсіўнасць і накіраванасць. У БД адлюстроўваецца інфармацыя з 36 беларускіх, расійскіх, украінскіх перыядычных выданняў на трох языках. Аб'ём інфармацыі залежыць не толькі ад колькасці публікацый, але і ад суб'ектыўнага фактару – зацікаўленасці бібліятэк у адборы, сістэматызацыі, алічбоўцы дадзенай інфармацыі ў мэтах аб'яднанага інфармацыйнага рэсурсу [4].

Рэалізацыя інавацыйных падыходаў да фарміравання рэгіянальных краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў патрабуе ўлічваць шэраг фактараў: аптымізацыя суаднесенасці – уладанне дакументам і аддалены доступ да яго (або спалучэнне "рэсурснай" і "камунікатыўнай" стратэгіі дзейнасці бібліятэк); прыярытэтнасць камплектавання электронных рэсурсаў; пашырэнне сеткавага доступу да паўнатэкставых рэсурсаў бібліятэк, іншых генератараў сеткавых інфармацыйных рэсурсаў. Важнае значэнне маюць карпаратыўныя каталогі, базы даных, электронныя бібліятэкі і інш.

---


1. *Анахин, А.А.* Новые формы сетевого взаимодействия библиотек Республики Беларусь по созданию и использованию электронных ресурсов / А.А.Анахин // НТБ. – 2009. – № 1. – С. 61.

2. *Гридчина, Ю.* Комплексное решение проблем обеспечения сохранности и доступности краеведческих изданий в ОУНБ / Ю.Гридчина // Инф. бюл. РБА. – 2003. – № 24. – С. 175–176.

3. *Колегаева, С.Д.* Организационные изменения как фактор инновационного развития общедоступных библиотек / С.Д.Колегаева // Румянцевские чтения: материалы Междунар. конф. (Москва, 10–12 апреля 2007 г.). – М., 2007. – С. 178–181.

4. *Куликова, О.Ю.* Взаимодействие библиотек приграничных территорий независимых государств Содружества / О.Ю.Куликова // НТБ. – 2009. – № 4. – С. 5–7.

5. *Шаталова, Н.В.* Формирование информационных ресурсов краеведения – важные направления региональной культурной политики / Н.В.Шаталова // Библиотечное дело – 2000: проблемы


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

формирования открытого информационного общества: тез. докл. – М., 2000. – № 1. – С. 242–243.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ